*Ірына Смірноеа*

**«БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ КАЛЯНДАР: ЮР'Я»** ***(паводле этнаграфічных фільмаў РУП «Белвідэацэнтр»)***

*Каб зразумець сябе сапраўдным чалавекам,*
*уявіць прыналежнасць да свайго роднага,*
*беларускага, славянскага, зразумець свае месца*
*ў сусвеце, неабходна вывучаць народныя*
*каштоўнасці, тое, што стагоддзямі*
*стваралі,*
*выкарыстоўвалі захоўвалі нашы продкі.*
І. В. Казакова

Адным з прынцыпова значных кірункаў вывучэння, зберажэння і распаўсюджвання народных каштоўнасцей з'яўляецца візуальная этнаграфія, якая шырока прадстаўлена ў розных мадыфікацыях беларускага дакументальнага этнаграфічнага фільма. Якаснай дакладнасцю дакументальнага этнаграфічнага фільма з'яўляецца двухадзінства навукі (этнаграфія, антрапалогія) і кінамастацтва, якое прадугледжвае арганічныя навукова-творчыя кантакты стваральнікаў фільма: навукоўца (як правіла, сцэнарыста), кінадакументалістаў (рэжысёр, аператар) і герояў карціны. Двухадзінствам навукі і мастацтва абумоўліваюцца даследчыя дакументальна-мастацкія задачы фільма: даследаваць і раскрыць характар самабытнай народнай культуры беларусаў у канкрэтных аўтэнтычных праявах пры дапамозе мастацткага кінавобраза.

Істотнае месца ў даследаванні самабытнай народнай культуры і стварэнні экраннага фонду этнаграфічнай спадчыны беларусаў прыналежыць Беларускаму відэацэнтру. Тут створана шырокая кінематаграфічная калекцыя, у якой знайшла сваё экраннае ўвасабленне беларуская традыцыйная культура. Этнаграфічныя фільмы «МІКОЛА ЗІМОВЫ», «ШЧОДРЫ ВЕЧАР», «МАСЛЕНІЦА», «ВЯЛІКДЗЕНЬ (ПАСХА)», «ЮР'Я», «КУПАЛЛЕ», «РАДУНІЦА. ДЗЯДЫ», «СЁМУХА» створаны на рэальным матэрыяле існуючых народных традыцый. Усе яны ўваходзяць у навукова-дакументальны цыкл *«Беларускі народны каляндар»,* задачай якога з'яўляецца паказаць асаблівасці існавання, рэальнае функцыянаванне ў сацыяльна-бытавой практыцы беларусаў дзён народнага календара - здзяўляючым тварэнні, што вырасла на глебе як матэрыяльнай, так і духоўнай культуры этнасу.

Беларускі народны каляндар у сваім кінематаграфічным увасабленні раскрывав складаны светапогляд беларускага селяніна, яго глыбокае веданне прыроды, любоў да зямлі, цягавітасць да працы, багатыя творчыя здольнасці і невычэрпную фантазію. Аўтар праекта і сцэнарыст - беларускі навуковец, даследчык нацыянальнай руральнай культуры Таццяна Кухаронак. Створаны ёю ў творчай садружнасці з кінарэжысёрамі В. Каралёвым, І, Волах, Р. Грыцковай найкаштоўнейшы цыкл фільмаў аб традыцыйных святах беларускага народнага календара з'явіўся экранным увасабленнем тыповай характэрнасці беларускай руральной культуры, яе індывідуальнай самабытнасці і дакументальнай сапраўднасці.

У народным календары беларусаў самы актыўны абрадавы комплекс прыпадае на вясну і восень - тыя поры года, калі чалавек засяваў ніву і ўбіраў яе. Такая акалічнасць невыпадковая. Пасля доўгага зімовага сну ажывала прырода, абуджалася да новага вітка жыцця маці-зямля. Думы і надзеі селяніна былі прасякнуты разважаннямі аб будучым ураджаі. Таму вясновы цыкл святаў прасякнуты надзённай марай людзей абудзіць жыватворную сілу зямлі. Сэнс восеньскай абраднасці - аддзячыць Багоў за здабыты ўраджай.

Адным з самых урачыстых дзён гадавога кола беларусаў з'яўляецца веснавое Юр'я, што адзначаецца 6 мая ў гонар св. Георгія - пераможцы і заступніка свойскай жывёлы і сялянскай нівы. Карані гэтага свята зыходзяць у глыбокую дахрысціянскую даўніну і звязаны з паганскім ушанаваннем Ярылы - звышнатуральнай істоты, якой падпарадкоўваліся дзікія жывёлы і апекаваліся хатняя жывёла і сялянская ніва.

Юр'я, мабыць, больш чым якое іншае календарнае свята, прэтэндуе на сапраўдны пачатак вясны. Гэта звязана з тым, што менавіта з Юр'я, як лічылі амаль паўсюдна, пачынае кукаваць зязюля. На Юр'я сяляне выходзілі з песнямі і ахвярнымі стравамі аглядаць свае зарунелыя палеткі. Як правіла з Юр'ем звязваўся першы выпас жывёлы. У беларусаў лічылася, што святы Юрай - «Божы ключнік», бо ў яго знаходзяцца ключы, якімі ён замыкае зіму і адмыкае вясну, выпускае расу, благаслаўляе ўсё навокал: зямлю, людзей і жывёл.

Рэшткі комплексу старажытных звычаяў, якія ладзілі ў гэты дзень нашы продкі, захаваліся яшчэ ў некаторых мясцовасцях Беларусі і да цяперашняга часу. Менавіта гэты неацэнны матэрыял лёг у аснову дакументальнага відэафільма **«Беларускі народны каляндар. Юр'я»** вытворчасці «Белвідэацэнтр» (Betacam SP, гукавы, каляровы, мова бел.-рус., 13 хв„ 2007 г. Сцэнарыст - Таццяна Кухаронак, рэжысёр Ірына Волах, аператар Сяргей Мілешкін, гукааператары Барыс Калякін і Аляксандр Васюк, рэдактар Вера Ганчарова).

Па сваёй змястоўнай накіраванасці фільм належыць да жанру фільма-нарыса, у цэнтры якога - старажытнае земляробскае свята беларускага народа - Юр'еў дзень (Юр'я, Юрай, Ягор'я, Ярыла). Фільм здымаўся ў Любаньскім раёне Мінскай вобласці. Героі стужкі - жыхары вёсак Закальнае, Обчын, Пласток, Таль, Ямінск.

Эстэтычная пазіцыя стваральнікаў фільма засноўваецца на строгім і дакладным аднаўленні ў мастацкай тканіне карціны элементаў беларускай народнай культуры ў аўтэнтычным, чыстым выглядзе. Галоўнай крыніцай выступаюць даныя, атрыманыя метадам непасрэднага назірання жыцця беларускага народа, пры дапамозе яго фіксацыі відэакамерай як інструментам даследавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У вобразнай структуры фільма духоўны свет і нацыянальныя рысы беларускага этнасу выяўляюцца праз прызму святочных абрадаў. Кампазіцыйна фільм складацца з эпізодаў, якія адлюстроўваюць комплекс народных звычаяў з відэафіксацыяй, апісаннем умоў і акалічнасцяў жыцця беларускага сялянства і прыроды.

Для надання адзінства абагульняючым кампазіцыйным кампанентам служыць закадравы аповед аўтара, які вядзе апавяданне аб звычаях і вераваннях, якія на Беларусі передаваліся продкамі з пакалення ў пакаленне як штосьці сакральнае, а да нашых дзён захаваліся ў выглядзе традыцыйных рытуалаў.

Свята Юр'еў дзень у сучасных жыхароў вёсак Закальнае, Обчын, Пласток, Таль, Ямінск напоўнена шматлікімі абрадавымі дзеяннямі. У гэты дзень яны імкнуцца праз прызму вясенніх абрадаў наблізіць прыход вясны і абудзіць жыватворную сілу зямлі. Так, раніцай, калі яшчэ не няміласць раса, сем'і выходзяць з дома, каб правесці адзін з абрадаў, які найболей захаваў сваю патрыярхальнасць. Гэта звычай абыходзіць поле з маладой рунню. Ён павінен забяспечаць багаты рост збожжа і добры ўраджай, ахову палёў ад граду і іншых прыродных стыхій.

Расу з зімавых жыхары акуратна збіраюць абрусам і адціскаюць у посуд, а потым самі качаюцца па ёй. Раса раніцай на Юр'я заўсёды лічылася лекавай як для жывёлы, так і для чалавека. Хто хацеў быць дужым і здаровым, павінен быў пакачацца гэтай раніцай па расе. Сяляне захоўваюць яе, як і калядную ваду, на працягу ўсяго года і выкарыстоўваюць як лекавы сродак.

Днём кожная гаспадыня клапоча поруч сваёй карміцелькі-каровы выконваючы пры гэтым шэраг магічных дзей: абыходзіць жывёлу з грамнічнай свечкай, апырсквае святой вадою, катае. гладзіць вараным яйкам па баках, каб карова была такая ж круглая і поўная. На плот загону гаспадыня вешае мужчынскія штаны, каб ахоўвалі яе жыёлу ад сурокаў Скаціну яна выганяе з хлява, пасьцёбваючы пасвенчанымі галінкамі вярбы, якія потым уторквае ў сцены хлява, каб абараніцца ад злых духаў.

Па вераваннях беларусаў, святы Юрый у гэты дзень не толькі аб'язджаў на белым каню і браў пад сваю абарону свойскую жывёлу, але і дапамагаў пастухам. Таму ў святкаванні Юр'ева дня пастух адыгрывае вельмі важную ролю. Пастуха сяляне выбіраюць старанна. Ён павінен добра ведаць абрады і змовы, каб здолець захаваць статак на ўвесь перыяд выгана. Пастух таксама выконвае пэўныя абрады, накіраваныя на захаванне скаціны ад драпежнікаў, бо спакон вякоў на Беларусі лічылася, што Юр'я замыкае пашчы ваўкам. Кожны гаспадар імкнецца падрыхтаваць пастуху добрыя закускі, з якіх потым ён будзе ладзіць сабе ў поле пачастунак і абыходзіць з ім статак.

Моладзь разам са старымі святкуе Юр'я. Так, напярэдадні Юр'ева дня дзяўчаты падрыхтавалі каравай, а днём разам з парнямі правялі кругавы карагод па маладым жыце, паднімаючы ўверх і раскалыхваючы каравай каб таксама высока расла жыта і раскалыхвалася ад цяжкіх саспелых каласоў. Каравай дзяўчаты ўпрыгожваюць галінкамі. Кожная галінка мае адметныя прыкметы, якія паказваюць яе прыналежнасць да вызначанай гаспадыні. Парні падыходзяць да каравая і выбіраюць сабе галінкі. Так утвараюцца пары.

Увечар вёска гудзе ад песень, танцаў і музыкі. Свята працягваецца. Святочныя застоллі праходзяць як у кругу сям'і, так і з запрашэннем у госці іншых сваякоў. Застолле абавязкова акрапляецца расой. А каб улетку хапляла дажджу, жанчыны імкнуцца абліць вадой аднаго із самых паважаных на сяле мужчын.

Калі сонца садзіцца, усё заціхае. У змярканні ў першы раз выганяюць у начное канёў. Свята ў гонар Юрыя, які выканаў самую ганаровую місію — выпусціў на белы свет жыватворчую сілу Маці- Зямлі - сканчаецца. Наступае новы дзень беларускага народнага каляндара.

Так дакументальны этнаграфічны фільм **«Беларускі народны каляндар. Юр'еў дзень»** фіксуе існуючую сацыякультурную традыцыю і выступае важнай аўдыёвізуальнай крыніцай звестак пра беларускае народнае светасузірання, прадстаўленнае ў выглядзе пэўнай карціны свету. Яго галоўная задача - раскрыць характар народнай культуры беларусаў у канкрэтных аўтэнтычных праявах. Зафіксаваная на плёнку, сама рэальнасць - традыцыйная беларуская культура - становіцца адначасова і дакументам, і экраннай старонкай летапісу беларускага народа. Праз абрадавы цыкл, бытавыя падрабязнасці, алюзіі, выяўляюцца духоўны свет і нацыянальныя рысы светапогляду беларусаў.

**Спіс літаратуры:**

1. Васілевіч, У.А. Беларускі народны каляндар / У.А. Васілевіч // Паэзія беларускага земляробчага календара / склад. А.С. Ліс. - Мінск, 1992. - С. 554-612.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ